АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАУСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ

На правах рукапісу

**ВАЛОДЗІНА Таццяна Васільеўна**

# ТАЛАКА Ў СІСТЭМЕ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

10.01.09 — фалькларыстыка

## АЎТАРЭФЕРАТ

**дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук**

**Мінск — 1994**

ЛННБ України ім.В.Стефаника
00778711 (V)

Работа выканана ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі

Навуковы кіраўнік — кандыдат філалагічных навук
А.С. ЛІС

Афіцыйныя апаненты — доктар філалагічных навук,
прафесар К.П. КАБАШНІКАЎ

кандыдат філалагічных
навук М.П. АНТРОПАЎ

Вядучая арганізацыя — Інстытут павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі

Абарона адбудзецца "24" чэрвеня 1994 года ў 14 гадзін на паседжанні спецыялізаванага савета К 006.07.01 па прысуджэнню вучонай ступені кандыдата навук у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі /220600 Мінск, вул. Сурганава, 1, корп.2/.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы ім. Якуба Коласа АНБ /Мінск, вул. Сурганава, 15/.

Аўтарэферат разасланы "23" мая 1994 г.

Вучоны сакратар
спецыялізаванага савета

кандыдат філалаг. навук
Л.М. Салавей

ЛНБ ім. В. Стефаника
АН України

АВ-30.452

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

Актуальнасць тэмы. У кантэксце нацыянальнага Адраджэння, станаўлення беларускай дзяржаўнасці асаблівую важнасць набывае выяўленне механізмаў захавання традыцыйных культурных каштоўнасцяў, накіраванае, у канчатковым выніку, на самазахаванне этнічнай свядомасці. У сувязі з гэтым актуалізуецца вывучэнне, спасціжэнне духоўнай культуры народа, арганічнай часткай якой з'яўляецца каляндарна-абрадавы фальклор. Пры сваёй сезонна-земляробчай накіраванасці абраднасць разам з тым рэгулюе адносіны як у межах соцыума, так і ў сістэме "Космас — Чалавек". Сэнс звычаяў і вераванняў беларусаў у пэўнай ступені можа быць раскрыты праз рэканструкцыю міфапаэтычнай карціны свету, якая цалкам і не ўсведамляецца ў паўсядзённым жыцці і ў рэальных правілах паводзін.

Талака — адносна самастойны комплекс у складзе беларускай народнай культуры. Асноўны сэнс талочных абрадаў — выкананне пэўнай гаспадарчай працы грамадой у адным з сялянскіх двароў — знайшоў выражэнне ў цэлым шэрагу утылітарных і магіка-сімвалічных дзеянняў, прызначэнне якіх заключалася ў забеспячэнні як усей талацэ, так і кожнаму яе члену гаспадарчага дабрабыту, урадлівасці глебы, здароўя і дастатку.

Аналіз талочных звычаяў і песень дае магчымасць больш глыбока вывучыць асобныя аспекты духоўнай культуры беларусаў: сувязь земляробчай абраднасці з культам продкаў, з эратычнымі культамі, сімвалічнасць прадметаў паўсядзённага ўжытку і інш. Разам з тым, даследаванне традыцыі талакі цікава не толькі ў плане разумення яе функцыі і семантыкі, але і, што найбольш актуальна, будзе садзейнічаць асвятленню праблем этнічнай гісторыі беларускага народа.

Актуальнасць працы вызначаецца і тым, што да гэтага часу ў беларускай фалькларыстыцы не было спецыяльных навуковых прац, прысвечаных талочнай абраднасці, а таксама фактычнай невывучанасцю талочных песень як міжжанравай групы твораў вуснай народнай творчасці.

Мэта і задачы даследавання. Мэтай дысертацыі з'яўляецца вывучэнне комплексу талочнай абраднасці і вербальных кампанентаў на Беларусі ў XIX — XX стагоддзях. Для дасягнення пастаўленай мэты ў працы робіцца спроба вырашэння наступных задач:

— сістэматызаваць і апісаць асноўныя з'явы і элементы талочнай абраднасці, прасачыць іх функцыянальна-семантычнае напаўненне і ролю

ў рытуале;

— выявіць унутранае ўзаемадзеянне і ўзаемасувязь асобных элементаў і матываў талочнай рэальнасці;

— вызначыць месца і ролю талочных песень у структуры абраду, разгледзець іх змест і суадносіны з другімі кампанентамі абраду ў плане семантыкі, выявіць спецыфіку іх кампазіцыі, вобразнасці і выяўленчых сродкаў;

— даць тлумачэнне асобным фальклорным матывам і абрадавым дзеянням, зыходзячы з іх першапачатковага прызначэння і рытуальных функцый.

Усе гэта дазволіць гаварыць аб талацэ як аб цэласнай мастацкай сістэме, падпарадкаванай агульным заканамернасцям і пабудаванай па адзіных прынцыпах фальклорнай эстэтыкі.

<u>Крыніцы даследавання.</u> У працы выкарыстаны шматлікі фальклорна-этнаграфічны матэрыял, зафіксаваны ў дарэвалюцыйных і савецкіх выданнях і навуковай літаратуры. Значную ролю адыгралі звесткі аб талацэ і яе песнях, сабраныя ў выданнях У.М.Дабравольскага, Ю.Ф.Крачкоўскага, Н.Я.Нікіфароўскага, Е.Р.Раманава, П.В.Шэйна, М.Федароўскага, запісы М.Анімеле, І.Танскага і іншых збіральнікаў, а таксама тамы "Восеньскія і талочныя песні" і "Жніўныя песні" (складальнікі А.С.Ліс, В.І.Ялатаў, С.Т.Асташэвіч) з серыі "Беларуская народная творчасць".

Добрай крыніцай для вывучэння талочных звычаяў з'яўляюцца слоўнікі народных гаворак, і ў першую чаргу "Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча" ў пяці тамах і "Слоўнік смаленскіх гаворак". Значную каштоўнасць уяўляюць тэксты і этналінгвістычныя заметкі, якія ўзяты з наступных архіваў: Архіва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, Архіва навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору і дыялекталогіі БДУ, Палескага этналінгвістычнага архіва Інстытута мовазнаўства АН Беларусі, Архіва Расійскай АН (Санкт-Пецярбургскае аддз.), Архіва Інстытута рускай літаратуры (Пушкінскі дом), Архіва Рускага геаграфічнага таварыства.

Істотную частку сведчанняў, выкарыстаных у працы, складаюць палявыя матэрыялы аўтара, сабраныя ў час экспедыцый. Атрыманыя звесткі адпаведна дакументаваны і захоўваюцца ў Архіве ІМЭФ АНБ.

<u>Метадалагічная аснова даследавання.</u> Метадалагічнай асновай для напісання работы паслужылі асноўныя агульнатэарэтычныя даследа-

ванні па фалькларыстыцы і навуковыя распрацоўкі па праблемах традыцыйна-бытавой культуры А.К.Байбурына, Д.К.Зяленіна, М.І.Талстога, Б.М.Пуцілава, В.М.Цярноўскай і другіх вучоных, а таксама фундаментальныя даследаванні замежных культуролагаў Л.Нідэрле, Дж.Фрэзера, М.Дваракоўскага.

У дысертацыі выкарыстоўваліся навуковыя распрацоўкі сумежных навук: этналінгвістыкі, этналогіі, псіхалогіі, мовазнаўства, гісторыі.

Прадукцыйным у вывучэнні язычніцкага светасузірання і звязаных з ім абрадаў з'яўляецца гісторыка-генетычны падыход да аналізу беларускіх фальклорна-этнаграфічных крыніц, а таксама параўнальна-тыпалагічнае супастаўленне іх з этнакультурнымі дадзенымі іншых, і ў першую чаргу, усходнеславянскіх народаў, а таксама з балтыйскім фальклорам; апошняе з увагі на тое, што ў балта-славянскім арэале канцэнтруюцца ізаморфныя каляндарныя, міфалагічныя ўяўленні.Гэта дае магчымасць рэканструяваць найбольш раннія і поўныя павер'і і паэтычныя структуры. Разам з тым, у працы прадпрымаюцца спробы не толькі вызначыць архаіку вывучаемых талочных звычаяў, але і прасачыць па меры магчымасці іх развіцце.

Даследаванне вядзецца ў агульным рэчышчы вывучэння і рэканструкцыі самой сістэмы ўяўленняў аб свеце, аб архаічным мысленні, без якога немагчыма ніводная больш-менш надзейная інтэрпрэтацыя асобных фактаў традыцыйнай культуры.

Навуковая навізна і практычная каштоўнасць работы. Дысертацыя з'яўляецца першым спецыяльным даследаваннем, у якім разглядаецца ўвесь талочны фальклорна-этнаграфічны матэрыял Беларусі. Упершыню прадпрымаецца аналіз акцыянальных суадносін паэтычных тэкстаў с абрадавымі дзеяннямі, выяўляюцца заканамернасці, якія вызначаюць структурную арганізацыю песень. Упершыню таксама разглядваецца міфалагічны кантэкст талочнай абраднасці, яе песень і асноўныя элементы семантычнай сістэмы, якія праяўляюцца ў вербальных і невербальных тэкстах.

Перспектыўным уяўляецца і здзейснены ў дысертацыі падыход да талакі як своеасаблівага абыходнага каляндарнага звычаю, што дае магчымасць больш выразна вызначыць структуру ўсяго рытуала ў цэлым, зразумець семантыку яго кампанентаў.

Практычная каштоўнасць работы заключаецца ў тым, што яе вынікі могуць быць выкарыстаны ў розных галінах гуманітарных навук пры апісанні і вывучэнні быту, культуры, гісторыі беларусаў, а таксама ў

практыцы выкладання курсаў і спецкурсаў па фалькларыстыцы і этнаграфіі. Асобныя палажэнні могуць мець пэўную значнасць для беларускай фалькларыстыкі ў межах распрацоўкі праблем календара ў цэлым.

Апрабацыя работы. Асноўныя тэарэтычныя палажэнні дысертацыі і вынікі даследавання выкладзены ў выступленнях на міжнародных канферэнцыях: "Жыцце. Смерць. Бессмяротнасць" (Санкт-Пецярбург, 1993), "Балты і этнагенез беларусаў" (Мінск, 1993), на рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях: "Культура ў Рэспубліцы Беларусь: гісторыя, сучасны стан і перспектывы развіцця" (Мінск, 1993), "Віцебшчына старадаўняя і сучасная" (Віцебск, 1993).

Асобныя раздзелы дысертацыі, як і ўся работа ў цэлым, былі абмеркаваны на паседжаннях аддзела фальклору Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі.

Структура работы. Дысертацыя складаецца з уводзін, двух раздзелаў, заключэння, бібліяграфіі і дадатку-табліцы, у якой прадстаўлена размеркаванне асноўных рытэм у залежнасці ад тыпу талакі.

## ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва ўводзінах абгрунтоўваецца актуальнасць тэмы, вызначаюцца мэты і задачы даследавання, указваюцца крыніцы, вызначаецца навізна і практычная значнасць работы.

Раздзел 1. Структура и семантыка талочных рытуалаў.

Талочны абрад састаўляе істотны фрагмент духоўнай культуры беларусаў. Ён адлюстроўвае як разнастайныя сацыяльна-прававыя адносіны (структуру абшчыны, вераванні, маральна-этычныя погляды і асаблівасці традыцыйнай матэрыяльнай культуры), так і мастацкае ўсведамленне гаспадарчай рэальнасці.

Непазбежная неабходнасць узаемадапамогі ў вёсцы XIX — пачатку XX стагоддзяў абумоўлена рознымі прычынамі, сярод якіх немалаважную ролю адыгравала ўлада выпадковасцей (надвор'е, экстраардынарныя выпадкі) у сельскагаспадарчай вытворчасці, сезонны характар большасці відаў гаспадарчай дзейнасці, розніца ў патрабаваннях сялянскіх двароў, асабістыя няшчасці.

Разглядваючы структуру талочнага абраду, мы бачым асаблівым чынам арганізаваную разгалінаваную сістэму сімвалічна адзначаных дзеянняў, надзеленых магічнымі, дэманстрацыйнымі, гульнёвымі функцы-

ямі; своеасаблівы тэкст, дзе найбольш значныя прэдыкаты-моманты: запрашэнне, праца і талочнае застолле маркіраваны традыцыйна замацаванымі славеснымі формуламі, маніпуляцыямі з тымі ці іншымі прадметамі, пэўнымі ўчынкамі ўдзельнікаў.

Спецыфіка талочнага абраду заключаецца ў тым, што ён непасрэдна звязаны з пэўнай працоўнай гаспадарчай дзейнасцю і фактычна накіраваны на яе поспех.

Талочная рэальнасць — гэта комплекс актаў, абрадавых дзеянняў, якія выконваюцца ў пэўнай паслядоўнасці. Кожнаму з іх адпавядае свая функцыя, сваё практычнае і сімвалічнае значэнне. Аналізуючы структуру талочнай абраднасці, трэба мець на ўвазе разнастайнасць тыпаў талакі ў залежнасці ад віду гаспадарчай працы і ад формы арганізацыі ўзаемадапамогі. Так, даволі простая "стрыжнёвая" кампазіцыя пры малачэнні ці апрацоўцы лёну суадносіцца з разгалінаванай, арганічна злітай са жніўнымі абрадамі дажынкавай талакой.

Мноства элементаў, якія ўтрымліваюцца ў розных варыянтах абраду, можна ўпарадкаваць дваяка:

1) максімальны інварыянт — гіпатэтычны абрад, які ўключае ўсе элементы, што прысутнічалі ва ўсіх варыянтах;

2) мінімальны інварыянт, які складаецца толькі з тых элементаў, што прысутнічалі ва ўсіх варыянтах.

Канкрэтны абрад размешчаны як бы "паміж" указанымі інварыянтамі — ён заўсёды ўключае ў сябе элементы максімальнага, але амаль ніколі не супадае з мінімальным. Мінімальны інварыянт, ці асноўныя моманты, якія ўстойліва паўтараюцца з талакі ў талаку, складае "абрадавую канстанту", без якой дапамога аднавяскоўцаў у народнай свядомасці не разумелася як талака. У беларускай традыцыі такімі абавязковымі часткамі кожнага канкрэтнага абраду з'яўляюцца: запрашэнне (рашэнне сходу), талочная праца, якая ўключала шматлікія магічныя, гульнёвыя дзеянні, і талочнае застолле.

Побач з абрадавай канстантай існуе група рытуальных дзеянняў, якія не выконваюцца з такой строгасцю, як абавязковыя. Іх можна назваць дапаўняльнымі ці факультатыўнымі. Для зручнасці аналізу структуры талочнага абраду мэтазгодна карыстацца паняццем рытэмы — "прасцейшай адзінкі рытуальнага дзеяння, якая характарызуецца ўнутранай сэнсавай завершанасцю і функцыянальнай значымасцю ў рамках дадзенага абраду; мэтанакіраванае ўзаемадзеянне розных элементаў рытуалу (выкананне, тэкст, прадмет) утварае рытэмы, пасля-

доўнасць якіх, падпарадкоўваючыся пэўным правілам рытуальнага сінтаксісу, складаецца ў абрад".*

Найбольш характэрнымі для талочных абрадаў з'яўляюцца наступныя рытэмы:

а) запрашэнне; б) спажыванне кашы; в) ужыванне гарэлкі;

г) пляценне вянка; д) качанне/кулянне; е) абліванне вадой.

Наяўнасць рытэм у канкрэтным абрадзе залежыць ад віду талакі, прычым у розных месцах можа быць рознай, бо адзіны у сваіх істотных прыкметах беларускі талочны абрад разам з тым — разнастайны ў канкрэтных лакальных праяўленнях.

Трэба адзначыць таксама, што адносна добрая захаванасць і багацце талочных звычаяў і асабліва песень складаюць спецыфіку беларускага фальклору, хоць з некаторымі рытэмамі могуць быць праведзены паралелі са звычаяў узаемадапамогі як славянскіх, так і неславянскіх народаў.

Тыпалагічная прырода талакі і яе нефіксаванае месца ў календары рабілі яе структуру адкрытай, вызначаючы магчымасць асіміляцыі ў лакальных варыянтах з элементамі суправаджальных абрадаў, як напрыклад, зліццё дажынкавай талакі з абрадамі скачэння жніва, талакі па апрацоўцы лёну і сукна з вячоркамі, супрадкамі.

Талочныя звычаі ўмоўна можна падзяліць на "аграрныя" (вываз гною, сенакос, дажынкі, дарыўкі) і "вытворчыя" (будаўніцтва хаты, малацьба, супрадкі, трапанне лёну і інш.). Для аграрных талок характэрна больш складаная структура, але кожны з талочных абрадаў можна назваць поліфункцыянальным і полісемантычным. Талака аб'ядноўвае розныя міфалагічныя ўяўленні, вераванні, звязаныя са светам рэальным, зямным, і светам "іншым", замагільным, патрабаванні практычныя, жыццёвыя, а таксама сакральныя, інтарэсы абшчынныя і асабістыя. Дамінуючая ў аграрных талоках земляробчая семантыка ўскладняецца і дапаўняецца рытэмамі, звязанымі з культам продкаў, з вялікай групай эратычных рытуальных дзеянняў, магічных прадпісанняў і засцярог. Але сувязь гэтых актаў і дзеянняў з аграрнай семантыкай арганічна, бо яны ў канчатковым выніку звязаны з магіяй урадлівасці.

<u>1.1. Рытэмы талакі.</u> Запрашэнне — першае неабходнае звяно ў

---

* Елизаренкова Т.Я. Сыркин А.Я. К анализу индийского обрядового гимна // Труды по знаковым системам. Т.2. Уч. записки Тартуского ун-та. 1965. Вып.181. С.178.

структуры талакі. Варыянтам запрашэння з'яўляўся зварот аднаго з членаў абшчыны да сельскага сходу, аднаго з гаспадароў да аднавяскоўцаў з просьбай аб дапамозе. Аказанне дапамогі трапіўшаму ў бяду селяніну магло адбывацца і без яго папярэдняга запрашэння; для пэўных работ на талаку не склікалі, а па даўняму звычаю "ўсёй грамадой" дапамагалі па чарзе кожнаму гаспадару ў вёсцы.

Гнаёвую талаку справядліва можна разглядаць як першае звяно ў нялёгкім земляробчым цыкле, як пачатковы акорд у гадавым крузе вырошчвання хлеба. Перажыванне ж якога б ні было першага аўтаматычна пераўтварае сітуацыю, надае ёй падкрэслена рытуалізаваны характар. Сакральным станавілася практычна кожнае дзеянне ў складзе гнаёвай талакі, цэлы дзень быў запоўнены шматлікімі прадпісаннямі, забаронамі і перасцярогамі, дзеяннямі як станоўчай, так і адмоўнай магіі. Дастаткова напружаная атмасфера гнаёвай талакі дапаўнялася і тым, што вываз з гаспадаркі якіх бы ні было рэштак і адкідаў лічыўся небяспечным.

Аналіз талочнага абраду дазваляе выявіць захаванасць архаічных элементаў, часта пераарыентаваных у гульнёвым плане магічных дзеянняў. Так, абліванне вадой суадносіцца як з імітатыўнай магіяй (калі вада прыпадабняецца дажджу), так і з прадуцыравальнай (калі вада палівае і забяспечвае ўрадлівасць). Уяўленні аб паліванні (у прыватнасці апошніх каласоў) як ахвяры зліліся з культавым ачышчальным значэннем вады наогул і гэтым пашырыліся функцыянальныя адценні вады ў народнай культуры. Характэрнае для талочных дажынак качанне/кулянне па ніве прадстаўлена шырокім кругам варыянтаў і, па-першае, сімвалізуе максімальнае зліццё з зямлёй і стымулюе паспяховы рост збожжа, па-другое, мае на мэце прафілактычнае перадухіленне звязанай са жнівом хваробы і вяртання патрачанай сілы. Значная колькасць варыянтаў гэтай рытэмы, і ў першую чаргу, качанне па "барадзе", выяўляе непасрэдную сувязь са шлюбна-эратычнай тэматыкай, заснаваную на ўсведамленні апошніх каласоў як носьбітаў эратычнага сэнсу і як пэўным сімвале мужчынскага пачатку. Верагодна, фалічныя адценні апошніх каласоў маглі ўзнікнуць на аснове цэнтральнай семантыкі "барады" — забеспячэння ўрадлівасці, пладаноснасці; а таксама з'яўляцца састаўным элементам шлюбна-любоўнай семантыкі дажынак наогул.

Талака ў народнай традыцыі функцыянуе як агульнапрыняты сродак, які спрыяе перадшлюбным зносінам молодзі і значна палягчае выбар спадарожніка жыцця. Месца правядзення талакі станавілася своеасаблівай сцэнай шматлікіх абрадавых практык ясна выражанага шлюб-

на-эратычнага характару.

Асноўнае рытуальнае значэнне аднаго з цэнтральных талочных сімвалаў — вянка — увасабленне новага ўраджаю, плёну, багацця. Круг вянка сімвалізаваў гаспадарчы кругаварот і цыклічнасць часу наогул. Акрамя таго, выява кола вянка як ахова ад небяспечных сіл, перажытак салярнага культу і сімвал дзявочай чысціні адыгравала значную ролю ў талочнай абраднасці, садзейнічала замаўленню ўрадлівасці і дабрабыту; а таксама азначала канец паспяхова завершанай працы (дажынкавы вянок на ніве, вянок з толькі што вырванага лёну, які неслі гаспадыні, вянок, які везлі на апошнім возе ў час гнаёвай талакі, ускладалі на толькі пакрытую страху, вешалі на дах пабудаванага дома і г.д.).

<u>1.2. Рытуальныя функцыі талочнай ежы.</u> Пры аналізе талочных звычаяў шмат дае і разгляд харчавання, застолля ў сістэме рытуалу як цэлага, дзе яго сімвалічныя функцыі выходзяць на першы план, а утылітарныя значна адсунуты. Так, спажыванне кашы выступае не толькі ў сваім рэлігійна-магічным аспекце замаўлення гушчыні і ўрадлівасці пасеваў, заснаваным на сакральных функцыях добратворнага ўздзеяння кашы-зерня на зямлю і дабрабыт чалавека, а і як магічны кансалідуючы акт, калі сумеснае спажыванне кашы падкрэслівала прызнанне і зацвярджэнне кожнага ўдзельніка талакі ў сваёй прыналежнасці да дадзенага калектыва. Частаванне гарэлкай мела на мэце заклінанне вільгаці і плёну, падкрэслівала аднясенне талакі да ліку старажытных земляробчых абрадаў-свят. Разам з тым, у самім светаўспрыманні багатае застолле са шчодрым ужываннем гарэлкі стасавалася з адпаведна багатым будучым ураджаем і таму мела выразна магічны характар.

Абавязковым на талочным стале лічыўся і сыр, які, часткова дзякуючы свайму беламу колеру, асацыіруецца з жыццем, актыўным прадукцыйным пачаткам, з мужчынскай сілай. Выходзячы з фактаў укладання сыру ў "бараду", вербальных тэкстаў тыпу "дасі сыру — родзіш сына" і г.д., а таксама маючы на ўвазе несумненную паралель спелага жыта і дзяўчыны на выданні (гатовай да нараджэння дзіця), можна меркаваць, што сыр у народным уяўленні сімвалізаваў апладненне зямлі / жанчыны, захоўваючы ў традыцыйнай культуры і значэнне медыятара паміж светам рэальным і іншасветам.

Уключалася ў шэраг іншых рытуальных дзеянняў, накіраваных на забеспячэнне ўраджаю і на засцярогу ад шкодных уплываў, і рытуальнае ламанне лыжкі пасля талочнай вячэры.

<u>1.3. Культ продкаў у дажынкавай абраднасці.</u> Рытуалы з апошнімі

каласамі ўяўляюць сабой шматузроўневае перапляценне розных рэлігійных вераванняў, сярод якіх пэўнае месца займаюць і ўяўленні, звязаныя з культам продкаў. Сувязь жніва з гэтым культам знайшла адлюстраванне ў вераваннях беларусаў, згодна якім поспех у жніве залежаў ад апякунства продкаў, якія ў сваю чаргу патрабавалі пэўных рытуальных дзеянняў на працягу года. У многіх раёнах Беларусі пакінутыя каласы мелі назву "дзед", "дзяды", "дзедава барада". Гэтыя найменні звязаны з уяўленнямі аб існаванні міфічнага "дзеда", які распараджаўся ўраджаем: "бараду яму кідалі ў полі, каб дзед даў ураджай на наступны год сабраць". Улічыўшы асноўную семантычную прыкмету лексемы "дзед" як прыналежнасць да "таго" свету, праванерна дапусціць замацаваную ўжо ў самім абрадавым тэрміне сувязь апошніх каласоў з продкамі.

Многія з варыянтаў рытуалу ўключаюць у сябе абрадавую трапезу, лакалізацыя якой рэзка актуалізавалася — "на барадзе". Традыцыйна ежа на зямлі стасуецца з рытуальнымі дзеяннямі, звязанымі з культам продкаў, прычым гэта меркаванне падкрэсліваецца паўсюдна аднолькавым наборам страў — куцця, бліны, сыта, гарэлка.

Звяртае на сябе ўвагу патрабаванне "завіваць бараду" моўчкі, якое матывуецца страхам смерці, што магла спасцігнуць парушальніка забароны. Гэта маўчанне фактычна кадзіруе рытуальную смерць як імкненне ўступіць у кантакт з продкамі, звязвацца з якімі трэба было па іх "правілах". Другім такім правілам з'яўляецца неабходнасць маніпуляцый з "барадой" "наадварот" ці левай рукой. Як адзін з магчымых шляхоў сувязі з "тым" светам традыцыйна выступае сон — "бабы сажнуць снапы два, потым заснуць на ніве і ідуць дадому". Характэрны і тыя варыянты абраду, калі "бараду" палілі (в. Пушкары Віцебскага р-на), што наогул супастаўляльна з патрабаваннямі паліць салому ў калядную ноч з мэтай кантакту з продкамі. Паказальнае і запрашэнне на дажынкавую талаку праз акно.

У кантэксце аналізу сувязі рытуала з апошнімі каласамі з культам продкаў цікава разгледзець запрашэнне да гэтага дзеяння звяроў, радзей птушак, тыпу: "Ваўкі, мядзведзі, ідзіце бараду палоць, не пойдзеця сёння — не ідзіце ніколі". Атрымліваецца, прыход звяроў карысны толькі ў адзін пэўны момант, у другі час іх візіт непажаданы і нават шкодны. Такія ж дзве тэндэнцыі: 1) страх, імкненне ізаляваць сябе і 2) імкненне падтрымліваць сувязь — існуюць і ў адносінах да памершых. Магчыма, менавіта да іх за дапамогай і падтрымкай звярталіся земляробы ў такі ад-

казны дзень. Падтрымліваецца гэтая версія і супастаўленнем дадзенай формулы з калядднымі запрашэннямі на куццю Мароза, ваўка, мядзведзя і г.д., якія сімвалічна "замяшчаюць" прадстаўнікоў "таго" свету.

У кантэксце ўсяго вышэйсказанага "бараду" можна разглядаць як сімвал-медыятар паміж рэальным светам і продкамі. Самі ж дажынкавыя рытуалы з'яўляюцца яркай ілюстрацыяй тыповага для земляробчай культуры ўзаемапранікнення і перапляцення аграрных матываў з матывамі культу продкаў.

Не абыходзіць гэтых матываў і гнаевая талака. Пэўнай прадуцыравальнай накіраванасцю характарызуецца ўдзел у ёй пераапранутых запрошаных сялян — з тыповымі каляднымі маскамі казла, бусла, барана. Магчыма, удзел пераапранутых талачан у мінулым сімвалізаваў традыцыйны ў земляробчай абраднасці кантакт з продкамі, аб якім ускосна сведчыць і выкарыстанне пудзіла "дзеда", якога прывозілі на апошнім возе з поля і садзілі на кут.

1.4. Іншыя віды талакі. Амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі распаўсюджаны звычай уборкі сена талакой. Практыка калектыўнага выканання гэтай працы апіралася на аб'ектыўныя фактары, такія, як наяўнасць угоддзяў агульнага карыстання.

Восеньскія работы чаргаваліся з самастойнымі, хаця і невялікімі, святамі-прысвяткамі. Усе яны з нязначным інтэрвалам ішлі адно за другім, усе яны былі звязаны так ці інакш з заканчэннем таго ці іншага этапа ў гаспадарчай дзейнасці — уборкі лёну, капання бульбы, малацьбы і г.д. Кожная з гэтых работ у розных раенах Беларусі выконвалася талакой і суправаджалася невялікім калектыўным святочным баляваннем. Кожная сама па сабе такая праца якой-небудзь вехай у календары не з'яўлялася, але ўсе гэтыя талокі, аб'яднаныя разам у адзін ланцужок, могуць быць асэнсаваны як здзяйсняльны на рубяжы восені і лета цыкл з'яў каляндарнага парадку, у якім адлюстравалася этнічная спецыфіка беларускай земляробчай абраднасці.

Гаспадарчая значнасць і рытуальная закончанасць такіх святаў-прац знайшла выражэнне ў асобным найменні кожнага з іх: "дасеўкі", "завалочкі", "дакопкі", "дабіркі" "дамінкі" і інш. Вылучаюцца "ільняныя" талокі, бо цэлы цыкл па вырошчванню і апрацоўцы лёну з-за сваёй працаёмкасці, цяжкасці і патрабаванні выканання ў пэўныя тэрміны вымагаў склікання дамамогі.

Восеньскія талокі ўяўлялі сабой рэалізацыю асноўнай абрадавай схемы: запрашэнне, талочная праца, напоўненая рытуальнымі дзеяннямі

(абліванне вадой, пляценне вянка і г.д.), і талочнае застолле.

Для зімняга перыяда найбольш характэрны супрадкі, узаемадапамогі, у час якіх скублі пер'е і мялі сукно. На зімніх талоках, у прыватнасці, ажыццяўлялася важная для грамадства функцыя навучання і выхавання моладзі ў сістэме традыцыйных ведаў. Тут — у гульнёвых формах паводзін — маладым людзям прывіваліся нормы маральнага, псіхалагічнага, эстэтычнага парадку, тут яна набывала пэўныя навыкі зносін у будзённым і рытуальным жыцці, а таксама ў сферы мастацтва.

Незалежна ад пары году талака склікалася на рамонтныя работы, для будаўніцтва грэблі і дарогі, для перавозкі лесу, зрубу для пабудоў. Традыцыйна збіралася талака і для будаўніцтва самой хаты.

Пры адзінай сэнсавай напоўненасці лакальныя варыянты выканання абраду значна адрозніваліся. Як агульную тэндэнцыю можна адзначыць, што ў паўночнай і цэнтральнай частцы Беларусі талокі больш насычаны магічнымі дзеяннямі, у суправаджальных вербальных тэкстах іх таксама пераважае абрадавая накіраванасць.

Першы — бачны — план талакі ўсведамляецца:

— праз рытуалізаваны працоўны працэс, які ажыццяўляецца калектывам;

— праз абрадавыя практыкі больш вузкага сэнсу — качанне, абліванне і г.д.;

— праз сукупнасці забарон і прадпісанняў;

— праз калектыўнае спажыванне ежы.

Нябачны ж план талакі выражаецца ў спецыфічным настроі, эмацыянальным стане, карані якога ідуць у глыбіні міфапаэтычнага мыслення, што, прынамсі, у значнай ступені абумовіла сюжэтыку і вобразнасць талочных песень.

Талака ў сілу сваёй цеснай сувязі з другімі сферамі жыцця вёскі, з-за багатай мастацкай напоўненасці адыгравае значную ролю ў развіцці духоўнай культуры сялянства.

Раздзел 2. Функцыянальна-семантычная характарыстыка талочных песень.

Тэрмін "талака" разам з абазначэннем пэўнай этнаграфічнай рэальнасці, кантэксту, ужываецца і як найменне цэлага класа песень, прымеркаваных да гэтага рытуалу, як самастойны тэкст са сваёй структурай і семантыкай.

Талочныя песні ўваходзяць у сістэму розных каляндарных абрадаў і

цыклаў, а таксама могуць выконвацца сітуатыўна, як , напрыклад, на талочным застоллі пасля будаўніцтва хаты. Найменне "талака" азначае і тэматычныя групы бяседных песень, якія ўваходзяць у веснавы, летні, асенні і зімовы цыклы, і жанравую падгрупу веснавых песень часу вывазкі гною (усходняе Паазер'е), і сінонім жніўных, часцей дажынкавых, песень (цэнтральнае Палессе, шэраг раёнаў усходняй зоны Беларусі).

Вызначыць са строга тэрміналагічных пазіцый, якую песню можна лічыць талочнай, даволі цяжка, бо ніводна з агульнапрынятых прыкмет не з'яўляецца дастаткова ўстойлівай.

1. Першай і асноўнай прыкметай талочных песень з'яўляецца прымеркаванасць такіх песень да часу правядзення талакі, яе працы і застолля. Аднак, скажам, у полі талачане маглі спяваць уласна жніўную працоўную песню, а на застоллі застольную ці тыпова лірычную.

2. Другая з найбольш характэрных прыкмет — упамінанне ў саміх песнях талакі, талочнай працы і застолля. Але круг такіх песень дастаткова вузкі.

3. Яшчэ менш надзейная прыкмета — тыповая рытмічная структура. У асноўным талочныя песні вылучаюцца вузкараднай будовай верша, гнуткай рытмічна.

4. Даволі надзейнай адзнакай жанру з'яўляецца выдзяленне круга традыцыйных талочных сюжэтаў і матываў. Аднак неабходна адзначыць, што нямала матываў талочных песень паўтараецца ў каляднай, валачобнай, лірычнай паэзіі. Тыпова талочнымі можна было б назваць матывы самой працы, застолля, звароту да гаспадароў і супрацьпастаўленне сваёй талакі суседскай.

Своеасаблівымі "сігналамі" талочнай песні з'яўляюцца характэрныя зачыны тыпу "Талака, талака талачылася", "Талака, талака, талакі не ўняць", "Талачу, талачу, гарэлкі хачу" і інш.

5. Істотным лічыцца і фактычнае аднясенне песень самімі выканаўцамі да разраду талочных.

6. Важную ролю ў жанравызначэнні талочных песень адыгравае і іх музычны аналіз. "На Віцебшчыне распаўсюджаны арагінальныя талочныя напевы, якія прыкметна адрозніваюцца ад мелодыкі іншых раннетрадыцыйных жанраў і трывала захавалі сезоннасць свайго выканання. Гукавышынная структура іх — квартовы лад з яўна акрэсленымі вышыннымі межамі і субквартавай ячэйкай. Рытм кананічна талочных песень мае формульную структуру і сведчыць пра пэўныя сувязі з працоўнымі працэсамі... Беларускія талочныя песні з'яўляюцца раздзелам

традыцыйнай песнятворчасці вольнай прымеркаванасці, што родніць іх, з аднаго боку, з песнямі каляндарнымі, а з другога — з бытавымі. Адсюль і іх інтанацыйная шматскладанасць".*

7. Адной з дыферэнцыяльных прыкмет жанру з'яўляецца і сацыяльны аспект: бытавая функцыя, пэўны сацыяльны кантэкст, сфера прымянення, што асабліва важна для талочных песень, якія адлюстроўвалі не толькі сезонную і гаспадарчую з'яву, а, у першую чаргу, адметную сацыяльную рэчаіснасць.

Такім чынам, міжжанравая група талочных песень уяўляе сабой з,яву даволі складаную і многапланавую, ахоплівае цэлую сферу жыццевых уяўленняў чалавека, сферу этычнай і псіхічнай дзейнасці, сферу пачуццяў і асаблівасцей іх увасаблення.

Зыходнай прадпасылкай пры даследаванні пытання жанравай спецыфікі талочных песень з'яўляецца меркаванне аб іх жанравай неаднароднасці, абумоўленая не толькі тэматыкай, а і аднясеннем да таго ці іншага абраду, характарам замацавання ў структуры абраду, спецыфікай бачання рэчаіснасці, а таксама рэгіянальнымі асаблівасцямі талакі.

Талочныя песні правамерна разглядаць як элемент традыцыйнай культуры, а гэта некалькі іншы аб'ект вывучэння ,чым песні як мастацтва слова. Для даследавання песень талакі больш перспектыўны семіятычны падыход да фальклорных фактаў, які ўлічвае іх пазатэкставыя сувязі, рытуальна-магічныя і сацыяльна-бытавыя функцыі і г.д.

Тэксты талочных песень утрымліваюць у сабе звесткі аб асобных фактах бытавой і працоўнай дзейнасці, аб рытуальнай практыцы, аб прадметах матэрыяльнай культуры і інш. На іх аснове можна гаварыць аб некаторых архаічных уяўленнях, аб вераваннях і свядомасці чалавека наогул. Адзначаныя высокай стабільнасцю традыцыйнай асновы талочныя песні цесна звязаны з праяўленнямі каляндарна-абрадавага цыкла. Уключанасць у рытуал вызначае сувязь славесных тэкстаў з выражанымі на другіх "мовах" тэкстамі як у акцыянальным плане, так і ў плане зместу.

Значная частка талочных песень як бы адлюстроўвае "крокі" рытуальнага дзеяння. Але магчымасці талочных песень. ды і вербальных тэк-

---

* Ялатаў В.І. Мелодыка талочных песень // Восеньскія і талочныя песні. Мн., 1981. С.55-56.

стаў наогул, шырэй, чым толькі апісваць рэальны працэс, яны ўключаюць у сябе дадатковую інфармацыю, якая раскрывае агульнае назначэнне абраду, светапогляд народу. Такім чынам, талочныя песні з'яўляюцца добрай крыніцай для рэканструкцыі глыбіннага зместу ўсяго рытуальнага комплексу.

Трэба мець на ўвазе, што талочныя песні не аднолькава функцыянуюць у талочным абрадзе, г.зн. яны могуць з'яўляцца тэкставай рэалізацыяй абраду ці быць другаснымі ў адносінах да яго — выражаць лірычныя перажыванні ўдзельнікаў.

Талочныя песні з'яўляюцца часткай вербальнай структуры абраду побач з прыгаворамі, замовамі, прыпеўкамі, прыказкамі і г.д. Гэта моўнае выражэнне абраду ўключае ў свой склад абавязковыя тэксты, сярод якіх па-рознаму суадносяцца традыцыйна абрадавыя і не ўласна абрадавыя творы. Унутрыжанравая класіфікацыя талочных песень можа выглядаць наступным чынам:

1) песні з міфічнымі матывамі;

2) песні, якія перадаюць характар талочнай працы, талочнага застолля, адметнасць талакі як гаспадарча-абрадавай з'явы;

3) пераважна лірычныя песні, традыцыйна замацаваныя за талочнай працай, талочнай урачыстасцю.

2.1. Даволі цікавым і перспектыўным здаецца вывучэнне талакі, яе песень як абраду, што па сваей структуры і функцыях максімальна набліжаны да так званых абыходных каляндарных абрадаў славян, да якіх адносяцца калядныя, валачобныя абходы двароў, палескі "куст", "вьюнишник" у шэрагу рускіх абласцей, лазарскія звычаі ў паўднёвых славян, ваджэнне дадолы ў сербаў і пеперуды ў балгар і г.д.

Л.Н.Вінаградава, разглядаючы ў шырокім кантэксце звычаі славян, выдзеліла наступныя асноўныя кампаненты структурнай схемы абыходных абрадаў: "а) наведванне дамоў; б) з пэўнай рытуальнай мэтай; в) атрыманне дароў".* Маючы на ўвазе той факт, што талака мяркуе пачарговае выкананне пэўнай працы ў некалькіх ці нават ва ўсіх гаспадароў вёскі, талочная абраднасць поўнасцю ўкладваецца ў дадзеную структурную схему, толькі з той розніцай, што талака — не строга замацаваная за пэўным рытуальным часам падзея (як валачобны абрад пры-

* Виноградова Л.Н. Зимняя календарная поэзия западных и восточных славян. М., 1982. С.21.

меркаваны да Вялікання), а з'ява, што ўключае ў сябе больш шырокі часовы кантынуум — праца-абыход двароў у гаспадарчы сезон вывазкі гною, жніва. Выключаючы са структурнай схемы талакі ўласна працу, якая папярэднічала рытуальна адзначаным кампанентам абраду ці ўключала іх у сябе, абрадавае афармленне талакі на аснове пададзенай вышэй схемы можна прадставіць у наступным выглядзе:

а) шлях талачан да гаспадара, сустрэча з ім;

б) пэўная рытуальная мэта наведвання;

в) атрыманне ўзнагароды — вячэра ў гаспадара.

Калі пад рытуальнай мэтай разумець абрадавае ці гульнёвае назначэнне візіту, мэта прыходу да гаспадара розніцца, у першую чаргу, ад віду талакі, але яна выразна акрэслена і замацавана ў свядомасці ўдзельнікаў абраду. У асобных відах талакі гэта назначэнне нават рэальна выражана, як напрыклад, прынясенне пэўнага абрадавага знаку — вянка ці апошняга снапа на дажынках, "дзеда" ў час вывазкі гною. Натуральна, пры разбурэнні і страце магічнай функцыі на першы план усё выразней выступала мэта утылітарная — адпачыць і пачаставацца пасля выкананай працы, а таксама забаўляльны намер талачан, бо вячэра ў гаспадара абавязкова ўключала песні, жарты, весялосць. Пры значнай ступені варыятыўнасці пералічаных элементаў абраду найбольш устойлівым паўсюдна застаецца абавязковы момант частавання, вячэры, які звычайна разглядваецца як узнагароджанне за працу і добрыя пажаданні.

Стасуюцца з залічэннем талакі да абходных звычаяў і прамыя ўказанні на ўключэнні ў абрад абыходу двароў з акрэсленай мэтай велічання ў шэрагу рускіх абласцей.

Як і многія іншыя абыходныя звычаі каляндарная талака характарызуецца абавязковым уключэннем у традыцыйную схему абраду тэкста. Тэкст займае пэўнае месца, падпарадкоўваючыся строгім правілам развіцця абрадавага дзеяння. Структурная будова талочных песень у кантэксце самога рытуалу набывае наступны выгляд:

а) набліжаючыся да хаты, у двары, талачане выконвалі песні, асноўным зместам якіх з'яўляецца зварот да гаспадара, вызыванне яго з хаты на сустрэчу;

б) пры сустрэчы з гаспадаром талачане расказвалі яму аб выкананай працы, шляху да хаты, пра сябе і г.д.;

в) выказваліся кароткія пажаданні і просьбы ці патрабаванні аб узнагародзе.



ЛНБ ім. В. Стефаника
АН України

Гаворачы аб падабенстве талочных песень з абыходнымі, трэба мець на ўвазе, што калі калядных ці валачобных песень у адным двары выконвалася абмежаваная колькасць, ці нават наогул адна, то талочных песень выконвалася шмат. І яны ў пэўнай паслядоўнасці адна за другой стваралі даволі цэласную песенную будову са сваім уступам, асноўнай часткай і заключэннем.

Працоўная, жыццёва абумоўленая аснова талочных песень не гарантуе іх поўнай рацыянальнасці, не адмяжоўвае ад магіі. Найбольш значная з пункту гледжання абрадавага прызначэння талочных песень магічная канстатацыя-заклінанне багатага ўраджаю, семантычным ядром якіх з'яўляецца ўстойлівая разгорнутая формула,якая малюе гаспадарчы дастатак: "Радзі, Божа, жыта на навозе, дай, Божа, такое і на аблозе, жыта ядраное, калоссе буйное". Этнаграфічныя апісанні абраду, сюжэтныя матывы "ўдзел Бога і святых у гаспадарчых справах", "вытворчасць хлеба", гіпербалічнае апісанне дастатку дазваляюць гаварыць аб талочнай абрадавай песні як рытуальна значымай магічнай адзінцы, аснову якой складае заклінальная функцыя.

Даволі значнае месца ў талочнай паэзіі займаюць вобразы гаспадароў. Песні, звернутыя да іх, шырока выкарыстоўваюць разгорнуты паралелізм, зусім не характэрны для тэкстаў абрадавай канвы. З яго дапамогай ствараецца непаўторны па сваёй мастацкай прыўзнятасці і дасканаласці вобраз жанчыны, прычым гэта не толькі і не столькі лірычнае замілаванне яе хараством і руплівасцю, колькі эпічны гімн простай сялянцы, якая за працу сваю заслугоўвае самага шчырага прызнання і павагі. Тэксты, звернутыя да гаспадара, выяўляюць асноўны аспект талочнай абрадавай паэзіі — яе земляробчую сутнасць.

2.2. <u>"Барада" і "бародныя" песні.</u> Талочнымі з'яўляюцца і так званыя "бародныя" песні, якія выконваліся ў час рытуалу з апошнімі каласамі і ўяўлялі сабой характэрнае для талочнай паэзіі наогул усхваленне гаспадара, часам супрацьпастаўленне яго багацця і шчодрасці скупасці суседа, зварот да гаспадыні. Іх сінанімічная назва "казёл" адлюстравала адпаведныя міфалагічныя ўяўленні і рэшткі архаічных абрадавых практык, заснаваных на вераваннях аб сувязі гэтай жывелы з ідэяй урадлівасці.

2.3. <u>"Спарышовыя" песні.</u> Талочнымі з'яўляюцца і так званыя "спарышовыя" песні, якія выконваліся на шляху талачан да хаты гаспадара. Яны ўражваюць эпічнай паважнасцю гучання, узнёслым пафасам і зрокавай пластычнасцю вобразаў. Для разумення іх функцыянальнай пры-

роды і семантыкі мэтазгодна прасачыць генэзіс асноўнага вобраза — міфічнага Спарыша.

З падвойным коласам — спарышом — у народнай традыцыі звязаны шматлікія вераванні з агульным значэннем "прынясенне, увасабленне прыбытку, багацця, спору".Тую ж семантычную нагрузку — спрыяць прыбытку — нясуць і спарыш-апошнія каласы, спарыш-сноп і спарыш-вянок, а таксама спарыня — закапаны ў зямлю казалак хлеба. Аднафункцыянальна таму і даволі абстрактнае пажаданне спору. Магічнае мысленне нашых продкаў выкарыстала падвойнасць спарыша для прыёмаў імітатыўнай магіі: з мэтай забяспечыць падобную ўрадлівасць. Анімістычнае светаразуменне зрабіла Спарыша, Спешку-Спарышку жывымі істотамі, надзеленымі тымі ж функцыямі, што і сам прадмет: здольнасцю забяспечваць спор.

Уяўленні аб Спарышы як бостве даволі відавочныя, цікава таксама суаднясенне яго з продкамі, даволі адметнае ў кантэксце дажынкавай абраднасці. Гэта сувязь праяўляецца ўжо ў супастаўленні спарыша-снапа і спарыні-"барады" з апошнімі каласамі як медыятарам паміж нашым і "іншым" светамі, акрамя таго, міфічнага Спарыша запрашаюць на кут, садзяць на золаце, частуюць тыповымі памінальнымі стравамі: мёдам, сытой, віном. Адметна, што вобраз Спарыша можа кантамінавацца ці то з міфічнай птушкай (яравая спарыня), ці то з матыльком (Спешка-Спарышка), а птушкі і матылькі ў народнай традыцыі ўспрымаліся як душы памерлых продкаў. У гэтым кантэксце цікава і суаднясенне Спарыша з боствам паміраючай і ўваскрасаючай раслінасці —егіпецкім Асірысам, балтыйскім Юмісам, якім прыпісваліся і хтанічныя функцыі, а таксама суаднясенні з дамавіком ("спорнікам") — адной з іпастасей продкаў.

Атрымліваем даволі незвычайнае сумяшчэнне ў адным вобразе Спарыша выразна акрэсленых рыс боства і аднагасова аднаго з прадстаўнікоў дэманалогіі — дамавіка, а часам навам самога д'ябла: "Катора баба заніміацця чародейством, то да яе пташка такая прылітае, спарыш завэцця, то чорт". Па-першае, правамерна дапусціць, што Спарыш — сапраўдны язычніцкі дэман, якога хрысціянства перавяло на "зямлю", паретварыўшы ў нячысціка. Але народная свядомасць пакінула і Спарыша-бога, які як нельга лепей адпавядаў самым запаветным марам земляроба аб урадлівасці і дабрабыце.

Да разумення першаснага значэння Спарыша набліжае і супастаўленне яго са змеем. Асабліва адметна ўспрыняцце Спарыша як вогненнага змея (параўн.: найменне спарыні — чорнага зерня -- галаўнёй,

яе з'яўленне ад маніпуляцый з галавешкамі). Паказальнымі ў супастаўленні спарыш — змей — агонь з'яўляюцца вераванні аб вужах, звязаных як з агнём, хатнім ачагом, так і з урадлівасцю палёў. Такім чынам, у аснове вобраза Спарыша ляжаць язычніцкія ўяўленні аб продках, ад якіх залежаў дабрабыт земляроба, і аб змеі як універсальным бостве ўрадлівасці.

2.4. "Раёк". Семантычна і функцыянальна да "спарышовых" песень набліжаны і так званыя "райкі" -песні, якія ўяўляюць сабой даволі строга вытрыманую структуру, заснаваную на запрашэнні гаспадаром Рая ў хату, у гаспадарку. Найменне асноўнага вобраза песень выяўляе сувязь як з пчаліным роем, што заканамерна ў кантэксце ўсёй жніўнай абраднасці, а таксама з імем хрысціянскага святога Юрыя — апекуна селяніна ў розных сельскагаспадарчых работах. У вобразе Рая ўвасобілася ідэя дабра, плоднасці, дастатку, урадлівасці. Ужо сам прыход такой істоты ў гаспадарку быў актам магічным, заклінальным, накіраваным на забеспячэнне плёну і здароўя на год наступны.

Натуральна, талочныя песні не маглі замкнуцца ў вузкім коле ўласна талочнай тэматыкі. У талочным застоллі, асабліва пасля пачатковай абрадавай часткі, дзе ўсё было тэматычна і эмацыянальна звязана з талочным звычаем, рытуалам, выкананай працай, пачыналі гучаць лірычныя, бытавыя матывы.

Талака і талочныя песні садзейнічалі кансалідацыі абшчыны, давалі сельскім працаўнікам фізічную, псіхалагічную і сацыяльную разрадку, служылі мэтам эстэтычнага выхавання, садзейнічалі праяўленню творчага пачатку асобы і народу ў цэлым, адпавядалі задачам пераемнасці пакаленняў, фарміраванню ўнутранага адзінства і нацыянальнай своеасаблівасці духоўнай культуры.

У заключэнні выкладзены асноўныя тэарэтычныя вынікі дысертацыі.

Вывучэнне талакі меркавала не толькі вылучэнне архаічных элементаў, але і апісанне ўсёй сукупнасці рытуальных дзеянняў у іх фактычным функцыянаванні. Гэта дало падставу бачыць у талацэ дастаткова складаную рэальную карціну, у якой прадстаўлена і больш позняе асэнсаванне абрадавых элементаў і нават складыванне іх у новы рытуальны тэкст (свята з нагоды сканчэння працы). Больш поўна абрадавая напоўненасць узаемадапамогі выявілася ў аграрных талоках. Іх акцыянальная структура ўключае шматлікія элементы аграрна-прадуцыравальнага характару (абліванне, качанне па зямлі, склад і характар рыту-

альнай ежы: наяўнасць сюжэтаў шлюбна-эратычнай тэматыкі, матывы культа продкаў).

Талочны абрад пранізаны глыбокімі міфалагічнымі, рытуальнымі інтэнцыямі, сэнс якіх можа быць выяўлены пры супастаўленні з іншымі каляндарнымі і аказіянальнымі практыкамі. У структуры талакі важнае месца займаюць сімвалы, як напрыклад, апошнія каласы ў час дажынкавай талакі. На аснове іх функцыянальнай характарыстыкі дажынкавы абрад можна інтэрпрэтаваць як рэдуцыраваны абрад-кантакт з "тым" светам, ад узаемадзеяння з якім залежаў будучы ўраджай і дабрабыт калектыва.

У талочных абрадах і звычаях знайшлі адлюстраванне своеасаблівыя зносіны чалавека з прыродай, сацыяльны вопыт і спецыфіка ўспрыняцця свету. Талака выступае як рытуалізаваная форма ўзаемаадносін паміж усімі членамі вясковай супольнасці (як жывымі, так і мёртвымі), з'яўляецца адной з умоў сацыяльнага з'яднання, сацыяльнай салідарнасці.

Вербальна-музычную структуру абраду складаюць песні, якія адпаведна іх рытуальнаму прызначэнню дзеляцца на дзве групы. Да першай адносяцца тэксты з міфічнымі матывамі, песні, якія перадаюць характар талочнай працы і застолля, у другую ўвайшлі пераважна лірычныя творы, традыцыйна прымеркаваныя да талакі.

Аналіз талочных песень дазваляе зрабіць вывад аб тым, што для іх характэрна пэўная абрадавая прымеркаванасць і функцыянальная зададзенасць.

Матэрыялы, якія былі прааналізаваны ў дысертацыі, сведчаць аб тым, што адна і тая ж міфалагема чытаецца ў фальклорных і этнаграфічных тэкстах. Найбольш істотны для рытуалу матыў забеспячэння плёну паўтараецца, перадаючыся на розных "мовах" : у песнях-заклінаннях, у прадметных сімвалах — "барадзе", вянку, кашы; у акцыянальным плане — качанні па зямлі, абліванні і г.д. Гэта забяспечвае ўстойлівасць усёй сістэмы рытуалу, надзейнасць яе функцыянавання.

Феномен талакі дазваляе падыйсці да праблемы суаднясення і адзінства вытворча-утылітарнага, звязанага ўласна з працай, і духоўна-творчага, што выліваецца ў мастацтва. Такая сінкрэтычнасць падкрэслівае тыповае для архаічнай культуры адухаўленне утылітарнага, уключанасць яго ў нарматыўна-ацэньвальную сістэму грамадства.

Талака існуе як цэлае, як рэальная з'ява. Незалежна ад абрадавай і міфалагічнай напоўненасці яна можа быць ахарактарызавана з пункту

гледжання псіхалагічнага, сацыяльна-бытавога і г.д. Тэма "талака" як цэлае не вычарпана. Вырашэнне многіх праблем гэтай тэмы дасць магчымасць падыйсці да вельмі важных сучасных пытанняў.

Асноўныя палажэнні дысертацыі адлюстраваны ў наступных публікацыях аўтара:

1. Культ продкаў у дажынкавай абраднасці // Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя грамадскіх навук, 1993, N 4. С.77 — 82, /на беларускай мове/.

2. Дожинковая "борода" как символ-медиатор // Жизнь. Смерть. Бессмертие. Материалы научной конференции. СПб., 1993. С.30 — 31, /на рускай мове/.

3. Спарыш: Бог ці д'ябал // Культура ў Рэспубліцы Беларусь: гісторыя, сучасны стан і перспектывы развіцця. Тэзісы дакладаў навуковай канферэнцыі. Мн.,1993, /на беларускай мове/.

4. Поліфункцыянальнасць абрадавага сімвалу ("барада" ў дажынкавай абраднасці на Віцебшчыне) // Віцебшчына старадаўняя і сучасная. Тэзісы дакладаў навуковай канферэнцыі. Віцебск, 1993, /на беларускай мове/.

5. Талака: тэкст і кантэкст // Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя грамадскіх навук. 1994, N 3. /на беларускай мове/.

Подписано к печати 21.04.94 Формат 60x84 1/16
Усл. печ. л. 1,16 Тираж 100 экз. Бесплатно. Заказ 0280.
ИПП Госэкономплана Республики Беларусь.

Ав 30.452